Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов

Республики Беларусь 10 августа 2007 г. N 8/16946

**ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**5 ліпеня 2007 г. N 31а**

**АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ІНСТРУКЦЫІ АБ ПАРАДКУ ПРАДСТАЎЛЕННЯ ДА ЎЗНАГАРОДЖАННЯ НАГРУДНЫМ ЗНАКАМ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ "ВЫДАТНІК АДУКАЦЫІ"**

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 мая 2002 г. N 238 "Об учреждении нагрудного знака Министерства образования "Выдатнік адукацыі" і Палажэннем аб Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 кастрычніка 2001 г. N 1554, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам Міністэрства адукацыі "Выдатнік адукацыі" (дадаецца).

Міністр А.М.РАДЗЬКОЎ

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.С.Якабсон
17.07.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
Л.Ф.Крупец
19.07.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Віцебскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.П.Андрэйчанка
19.07.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.Я.Саўчанка
19.07.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
К.А.Сумар
19.07.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
М.Я.Паўлаў
17.07.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
Б.В.Батура
18.07.2007

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
05.07.2007 N 31а

**ІНСТРУКЦЫЯ**

## АБ ПАРАДКУ ПРАДСТАЎЛЕННЯ ДА ЎЗНАГАРОДЖАННЯ НАГРУДНЫМ ЗНАКАМ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ "ВЫДАТНІК АДУКАЦЫІ"

1. Інструкцыя аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам Міністэрства адукацыі "Выдатнік адукацыі" (далей - Інструкцыя) распрацавана ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 мая 2002 г. N 238 "Об учреждении нагрудного знака Министерства образования "Выдатнік адукацыі" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., N 53-54, 1/3674) і вызначае парадак прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам Міністэрства адукацыі "Выдатнік адукацыі" (далей - нагрудны знак) работнікаў арганізацый сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь (далей - работнікі).

2. Для ўзнагароджання работнікаў нагрудным знакам кіраўніком арганізацыі прадстаўляецца ў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь суправаджальнае пісьмо на бланку арганізацыі і ўзнагародны ліст па форме згодна дадатку да дадзенай Інструкцыі.

3. Узнагародны ліст афармляецца на падставе станоўчага рашэння сходу калектыву работнікаў арганізацыі аб прадстаўленні да ўзнагароджання нагрудным знакам работніка.

4. Рашэнне калектыву работнікаў арганізацыі аб прадстаўленні да ўзнагароджання нагрудным знакам прымаецца на сходзе калектыву работнікаў адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў пры ўмове прысутнасці на ім больш 50% членаў калектыву работнікаў арганізацыі.

5. Узнагародны ліст узгадняецца для работнікаў устаноў і іншых арганізацый, падпарадкаваных:

Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь - са старшынёй прафсаюзнага камітэта арганізацыі;

упраўленням (аддзелам, камітэту) адукацыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў - з кіраўніком упраўлення адукацыі абласнога выканаўчага камітэта (камітэта па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта) і старшынёй абласнога галіновага прафсаюзнага камітэта;

іншым дзяржаўным органам - з адпаведнымі дзяржаўнымі органамі.

6. Для ўзнагароджання нагрудным знакам работнікаў цэнтральнага апарата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, дэпартамента кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляюцца дакладная запіска на імя Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь і ўзнагародны ліст, які ўзгадняецца са старшынёй прафсаюзнага камітэта Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

7. Ва ўзнагародным лісце адлюстроўваюцца інфармацыя аб рашэнні калектыву работнікаў і ўзгадненні, якія прадугледжаны дадзенай Інструкцыяй у выглядзе подпісаў кіраўнікоў арганізацый і прафсаюзных органаў, якія заверany пячаткай адпаведных арганізацый і органаў.

8. Работнікі арганізацый, якія ўзнагароджваюцца нагрудным знакам, заахвочваюцца грашовай прэміяй у парадку і ў памеры згодна з лакальным нарматыўным прававым актам арганізацый, але не болей за сем базавых велічынь.

Дадатак
да Інструкцыі
аб парадку прадстаўлення
да ўзнагароджання нагрудным
знакам Міністэрства адукацыі
"Выдатнік адукацыі"

УЗНАГАРОДНЫ ЛІСТ

1. Прозвішча ______________________________________________________
Імя і імя па бацьку _______________________________________________
2. Пасада і месца работы __________________________________________
__________________________________________________________________
3. З якога часу працуе на апошняй пасадзе ___________________________

4. Стаж педагагічнай ці навукова-педагагічнай работы ______________
5. Дата і месца нараджэння _____________________________________________
___________________________________________________________________
6. Грамадзянства ______________________________________________________
7. Адукацыя ___________________________________________________________
(указаць, калі і якую навучальную ўстанову скончыў)
___________________________________________________________________
8. Вучоная ступень і вучонае званне ____________________________
___________________________________________________________________
9. Якія ўзнагароды мае і дата ўзнагароджання _______________________
___________________________________________________________________
10. Дамашні адрас _____________________________________________________
___________________________________________________________________

11. ХАРАКТАРЫСТЫКА

___________________________________________________________________

12. Звесткі аб рашэнні ў калектыве работнікаў ______________________
(назва арганізацыі,
___________________________________________________________________
дата абмеркавання, нумар пратакола)
Кіраўнік арганізацыі _______________________________________________
(пасада, подпіс, ініцыялы, прозвішча)
М.П.
Старшыня прафсаюзнай арганізацыі ______________________________
(подпіс, ініцыялы, прозвішча)
"__" ___________ 200_ г.

УЗГОДНЕНА